# Студзень

1/19. Працяг **Піліпаўкі** (да 5 студзеня), апошні яе тыдзень.

*Новы год.* Цяпер адзначаюць не толькі каталікі, але і праваслаўныя. Для ўсіх галоўны атрыбут ёлка. Праваслаўныя традыцыйна будуць святкаваць новалецце без ёлкі з 13 на 14 студзеня.

Новы год (Capodanno) італьянцы звязваюць з Раством, зімовым сонцастаяннем, пачаткам каляндарнага года. Са старажытнасці існуе павер'е: які дзень будзе першага года, такім і усе наступныя 364. Сяляне таксама лічылі, што першыя 12 дзён прадказваюць надвор'е на 12 месяцаў. Гэтая форма прагноза называецца календы (calendae – першае чысло кожнага месяца па старажытнарымскаму календару).

У некаторых вёсках Іспаніі захаваўся звычай заключэння фіктыўных шлюбаў, у якіх бачацца рысы эратычнага культу. Згодна выцягнутай паперкі з імёнамі дзяўчаты і хлопцы атрымліваюць на свята права «нявесты» і «жаніха» і вядуць сябе адпаведна.

Раждзественскім дрэвам (Kerstboom) у Нідэрланадх і Бельгіі з'яўляюцца галінкі падуба, амёлы і ёлкі, традыцыя якіх прыйшла з Германіі. Магічным дрэвам у старажытных кельтаў было арэхавае дрэва, з якімі свае звычаі звязваюць народы Брытанскіх астравоў. Такім дрэвам у Скандынавіі можа быць, акрамя ёлкі, піхта, галінкі сасны і ядлоўца. У Швецыі ёлка была ўжо вядома з канца ХУІІІ ст. У самой Германіі ў якасці навагодняй зелені служылі не тоьлкі галінкі ёлкі, а ў некаторых раёнах выкарыстоўвалі таксама амелу, бук, ціс, ядловец. У Аўстрыі яшчэ – падуб, сасну. Некаторыя даследчыкі лічаць, што папярэднікамі ёлак былі галінкі вішні, сліў, яблынь, якія ставілі ў ваду перад Раством (КЗ, 1973. С. 150).

Звычай упрыгожваць ёлку ў некаторых еўрапейскіх народаў таксама з'явіўся не так даўно. Так, у Партугаліі і Іспаніі гэтая традыцыя прыйшла з Германіі; іспанцы зялёную прыгажуню называюць нямецкім дрэвам (arbol germanico). Каля ёлкі раждзественскі дзед, які вельмі падобны на Дзеда Мароза, водзіць карагоды і раздае дзецям падарункі.

У румынаў свой Дзед Мароз – мош Джэрыле ( mos Jarila), што раздае на Раство падарункі, узнік зусім нядаўна пад гарадскім уплывам. Але найбольш папулярны і насычаны абрадамі пярэдадзень Новага года, святы Васіля. Цікавы абрад калядавання «плугушорул» (plugusorul), які накіраваны на выклікание ўрадлівасці: чытаючы калядку аратая ўдзельнікі імітавалі дзеянне з плугам, хлопаннем бічом праводзілі першую баразну па снезе і г.д. (КЗ, 1973. С. 290-291).

У Югаславіі існуюць рэгіянальныя назвы Новага года: Малн Божни, Младн Божих, Васильев дан, Василица, Нова Година – сербы, чарнагорцы; Василица – македонцы; Novo Leto, Novo Godina, Mali Bozic – харваты; Novo Leto – славенцы. Бытавала нямала звычаяў, якія ў асноўным паўтаралі раждзественскія.

Народы Брытанскіх астравоў адзначаюць стары Новы год, 1 лістапада, які быў звязаны з асноўным заняткам кельтаў, жывёлагадоўляй, і як усе хрысціяне. У абраднасці, звычаях, маскарадах першага натуральна адчуваецца больш язычніцтва, архаічнасці, культа продкаў (с.80-82).

Цікавыя і багатыя звычаі Новага года, якія супернічаюць з Калядамі ў балгар. Многія з іх нясуць язычніцкі змест: дзіцячае «суркаванне», дзявочае «ладуванне» (або Дай-Лада), якое магчыма звязана з культам лады, і інш. (с. 276).

У Заходняй Балгарыі быў самым цікавым абрадам «сурвакары», які ўяўляў сабой пераапранутых у старца, бабу, нявесту, пагоншчыкаў вярблюдаў і коней і інш. (с. 276).

У Югаславіі таксама нядаўна пачалі ставіць ёлачку, а ўсё больш забываюць аб распальванні бадняка. Раней упрыгожвалі пакоі зеленню (галінкамі вішні, масліны, лаўра, сасны, дуба і інш.)

3/21. **Пракоп.** У пачатку Новага года народная творчасць не захавала ў сваёй памяці кананізаваныя царквою імёны св. пакутніка Ваніфацыя (290), прападобнага Іллі Мурамца (каля 1188), праведнага Іаана Кранштадскага (XIX ст.), свяціцеля Пятра, мітрапаліта Маскоўскага (1326) і іншых. А вось чамусьці засяродзілася на менш прыкметным імені прадстаўленні блажэннага Пракопія, Хрыста дзеля юродзівага, Вяцкага (1627). Захавалася прымаўка "Пракоп па снегу ступае, дарогу капае" (Паўлюкоўскі, 1934).

У Віленскай губерні бытавала: калі да Каляд застаецца два тыдні, то кажуць, што Каляды яшчэ ў амбары, калі два ці тры дні, то гавораць, што яны на печцы (Альшаны, Крачкоўскі, 1874). Маецца на ўвазе збожжа, мука, цеста і каляднікі, якімі адорваюць калядоўшчыкаў.

5/23. ***Посная,*** або ***Галодная куцця, Запіс Каляд*** у каталікаў.

Гаспадар крапідлам (пучок з сухіх калоссяў) акрапляе свянцонаю вадою хату і іншыя будынкі і ўсюды ставіць крыж (гэта называецца "запісаць Каляды"). (Сахараў, 1937; Раманаў, 1912).

Трэцяе зімовае свята, якое звязана з абрадавай стравай і акурваннем, у Балгарыі мае назвы Водици, Водокрьиши, Корст (Крыж), Крьстов ден. У асвячэнні вады і іншых звычаях, даследчыкі бачаць як хрысціянскія, так і язычніцкія рысы (КЗ, 1973. С. 278-279).

6/24. **Першая (Посная, Бедная, Вялікая, Марожаная) куцця.** Сямейная перадкалядная вячэра. Абрадавая страва -- звычайная ячная каша з алеем або мёдам. Лічылася: якая куцця, такі будзе і ўраджай; які дзень, такі будзе і год. Не сварыліся, не пралі, хавалі кудзелі, грабяні, верацёны. У хату прыносілі сена, за сталом выклікалі "мароза". А на Віцебшчыне гаспадар адчыняў акно і гаварыў: "Строк! А сторк (авадзень)! Просім да куцці, толькі маіх коней (валоў) не кугуці". (Нікіфароўскі, 1897). Падмяталі падлогу, а ў наступныя дні -- не, каб быў чысты лён. Існавала шмат іншых прыкмет і павер'яў. Існаванне ў дахрысціянскі перыяд святкавання Каляд пацвярджаецца пісьмовымі дакументамі, дзе гаворыцца аб забароне "елінскіх бесаванняў". Асаблівае старанне праяўляў маскоўскі царызм і руская праваслаўная царква, якія пазней свае карныя метады перанеслі і на беларускія землі. У Грамаце цара Аляксея Міхайлавіча аб Калядзе, Усені народных гульнях 1649 г. прадпісвалася "Тъмъ людемъ, за такия супротивныя христианскому закону за неистовства, быть отъ насъ въ великой опалъ и въ жестокомъ наказаньъ". У згаданым дакуменце ўпамінаюцца і асуджаюцца "ігрышча бясоўскія" ("въ навечери Рождества Христова кликали многие люди Каледу и Усень"). Акрамя "навячэр'я Раства" (перадкаляднай куцці) згадваецца і ўвесь калядны перыяд: "Да

на Рождество Христово и до Богоявленьева дни собираются на игрища сборища бъсовския" (Сахараў, 1885. С.388-390).

Звычай засцілання сенам падлогі вядомы многім народам Еўропы. Асабліва строга гэтай традыцыі прытрымліваюцца напярэдадні Раства (Jouluaatto) у Фінляндыі, дзе, як і ў Беларусі, упрыгожваюць нават столю над сталом саламянымі «павукамі». Выказваецца думка аб паралелях з яслямі Ісуса ў Віфлееме. Але галоўны сэнс даследчыкі бачаць у звычаі з саломай як сімвале ўраджаю і забеспячэнні будучага дабрабыту (КЗ, 1973. С. 129).

У некаторых ваяводствах Польшчы сяляне за вячэрай кідалі гарох у сцяну і крычалі: «Воўк, воўк, ідзі да гароху, а не прыйдзеш, то не прыходзь і ў новым годзе!» (с. 210).

Асабліва падобныя да беларускіх па форме назвы перадкаляднага дня і вечара ў Балгарыі: Малка Каледа, Каледето, Суха Коледа, Бьдни вечер, Срешу Колада, Каден вечер, Богата вечеря, Бьдна вечеря (бьеден – нядрэмны).

***Тры Каралі (Тры Кролі).***

Фальклярыст Міхаіл Федароўскі ў мінулым стагоддзі зафіксаваў павер'е, якое сваім зместам не мае дачынення да біблейскай гісторыі, звязанай з пакланеннем трох каралёў навароджанаму Выратавальніку: "Выгарнуўшы попел з ямкі на куццю, няможна выгортваць праз цэлыя Каляды, а назаўтра, па Трох Кролях, трэба попел выгарнуць, забраць у гаршчок ці ўва што схаваць, бо той попел калядны вельмі памоцны ад чарвей і мошкі. Як толькі пакажуцца на капусце, на бобе, будзь на чом чэрві або мошка, трэба пасыпаць калядным попелам, так і няведама дзе згіне" (Федароўскі, 1897. С. 373).

Павер'і пра попел магчыма маюць адносіны да шырокаўжывальнага ў краінах Еўропы звычаю палення вялікага раждзественскага палена ў печы і ўсё, што застаецца ад яго лічыцца магічынм. Напрыклад, скандынаўскія народы попел захоўваюць, на наступны дзень ім пасыпаюць жывёлу, што павінна абараніць ад хвароб, чорта і дурнога вока (КЗ, 1973. С. 108-109).

У Італіі называецца Epifania (ад грэч.  -- Богаз'яўленне), у Сардзініі ён вядомы як свята Трох Каралёў (is tres reis). Даследчыкі прыводзяць меркаванне, што Епіфаніі ўходзяць каранямі ў далёкую старажытнасць і звязаны з народнымі ўяўелннямі аб вадзе як аб ачышчальнай сіле. Яшчэ ў язычніцкім Рыме адзначалі свята, прысвечанае нараджэнню нейкага бога, падобнага на сонца і ганаравалі ваду. Выказваецца думка, што хрысціянская царква ўстанавіла дату хрышчэння Хрыста ў Іардане, якое блізка да гэтага свята і ўвяла рытуал асвячэння вады, пакланенне каралёў (КЗ, 1973. С. 29).

У многіх народаў прыкметы і прымаўскі сведчаць аб наступленні вялікіх марозаў. У цёплай Італіі заўважаюць, што мароз злуецца; у Польшчы кожны ў кажух туліцца: «Na widok Trzech Kroli Kazdy w kozuch sie tuli» (Ярмолаў, 1901. С. 34).

Іспанцы і партугальцы праводзілі «гульню караля», які аддаваў розныя загады, напрыклад, распрануцца поўнасцю, спяваць і г.д. Іспанскія даследчыкі падобныя забавы звязваюць з антычнымі Сатурналіямі, калі наўмысна парушаўся паўсядзённы парадак (КЗ, 1973. С. 65).

Цяпер у правінцыях Бельгіі і Нідэрландаў замест дарослых у ролі трох каралёў выступаюць дзеці з упрыгожанай зоркай на доўгай палцы (с. 78).

У многіх краінах наладжваюцца прадстаўленні з удзелам «трох каралёў». Шырока вядома і калядаванне са «звяздой» (dwiazda – польск., hviezda – славацк.).

У Румыніі са «звяздой» хадзілі ў першыя 2-3 дні пасля Раства.

(ГЛ. таксама: 19 студзеня).

7/25. **Каляды. Калядны Мясаед. Ражаство (Раство).**

Пачатак язычніцкага святкавання ў гонар зімовага сонцастаяння і Нараджэння Выратавальніка (Раство Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста). Даследчыкі лічаць, што ў IV ст. н. э. царкоўнікі атаясамлівалі міф аб нараджэнні сонца з міфам пра нараджэнне Хрыста, прыстасаваўшы новы культ да старажытнай сонечнай сімволікі (Гурскі, 1990. С. 14 – 15). Тым больш, калі ўлічыць той факт, што дата нараджэння Выратавальніка не аднойчы ставілася пад сумненне.

Наяўнасць канцэнтрацыі значнага навагодне-земляробчага і міфалагічна-паганскага пласта ў святкаванні дае падставу меркаваць аб кансервацыі ў ім моцнай дахрысціянскай культуры, прымеркаванай да зімовага сонцастаяння (21-22 снежня), на якую пазней была накладзена хрысціянская плынь, якая ў выніку сінкрэтычнага развіцця дала сучасна-ўяўляемую традыцыю беларускіх Каляд.

Пасля Піліпаўкі пачынаўся Калядны Мясаед (можна есці мяса), які цягнуўся да Вялікага посту. На поўначы Беларусі спявалі:

Нам Піліпаўка надакучыла,
Дзеўкам жываты перамучыла,
Мальцам жамеры зубы праелі,
А калядныя ж бліны ладныя,
А мікольскія -- не такоўскія.

Забіўшы перад Калядамі свінню, глядзелі яе нутро: калі "каса" (падстраўнікавая жалеза) акажацца роўнаю, то зіма будзе памяркоўнай; калі ж "каса" з патаўшчэннем, то зіма прыйдзе з моцнымі маразамі; тоўсты канец азначаў працяглую, халодную зіму (Раманаў, 1912). Існавала шмат іншых прыкмет і павер'яў.

На Каляды праводзілі ігрышчы, дзе танцавалі, гулялі, слухалі казкі, легенды, адгадвалі загадкі. У Стаўбцоўскім раёне такія вечарынкі называлі "Бай". На Случчыне пасля вячэры дзяўчаты бегалі ў хлеў "і мацалі гаўядо". Каторай пападаўся бык, лічылася, што яна выйдзе замуж, а калі карова -- то не (Сержпутоўскі, 1930).

Асаблівай папулярнасцю карысталася шлюбная карагодная гульня "Яшчур" ("Яшчар"), у якой праяўляюцца сляды ахвярапрынашэння цнатлівых дзяўчат старажытнаму дракону-яшчару -- гаспадару падводна-падземнага свету. У семантыцы старажытнага рытуалу, які перарос у гульню, адчуваецца ў вобразе Яшчура наяўнасць прыкмет паганскіх культаў Велеса і Лады (аб гэтым падрабязна мы пісалі раней, гл.:(Лозка, 1996. С.31-35; 1997. С. 124-128).

Як і ў найбольш старадаўніх варыянтах "Яшчура", так і іншых песнях прысутнічае слова ці прыпеў "Ладу, ладу". Сувязь двух боствaў -- гаспадара ніжэйшага свету, які выпускаў на ўсходзе сонца ў выглядзе галавы лася, і вялікай

багіні вясенне-летняй урадлівасці, апякункі вяселляў, шлюбнага жыцця -- лагічна. Распаўсюджанасць вясельна-шлюбных рытуалаў у Калядах даволі значная. Варта толькі нагадаць гульні "Жаніцьба Цярэшкі", "Жаніцьба Бахара", "Халімон" і інш. Таму і ўзнікае меркаванне аб этымалагічнай сувязі Калядаў са словам "Лада". Яшчэ рускі даследчык У. Чычараў звяртаў увагу на распаўсюджанне вясельных гульняў у навагоднім абрадзе і прыходзіў да вываду, што гэта сведчыць аб спрадвечнасці тэмы шлюбу на калядным ігрышчы і можа быць зразумета як пазнейшае відазмяненне звычайных у перыяд зімовага сонцазварота эратычных гульняў і палавых зносін, што ўпаміналіся яшчэ Стаглавам у сувязі з "бесовскими песнями и плясаньями", у час якіх "бывает отроком осквернение и девкам растление" (Чычараў, 1957. С.193). Аб эратычнасці ігрышчаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі і іх асуджэнні знаходзім у Несцеравым летапісе, спадчыне Кірылы Тураўскага і інш.

У феномене Каляд прысутнічае сінкрэтызм супрацьлеглых традыцый, паганства і непаганства (хрысціянства), язычніцкай эратычнай шлюбнасці і святога Нараджэння Госпада Бога. Гэтая супрацьлегласць яшчэ адзін і прытым несумненны доказ існавання моцнай дахрысціянскай традыцыі, што трансфармавалася ў сучаснае разуменне Каляд. У адной з калядак распавядаецца: "Як пайшла Каляда ўпярод Ражаства..." (Гарадзецкі раён). У.Чычараў лічыць, што калядная і шчадроўная паэзія склалася не на ўзроўні родавай, а сямейнай абшчыны (Чычараў, 1957. С. 120). Раство арганічна ўвайшло ў калядна-навагодні комплекс, што адзначаецца ў народнай традыцыі два тыдні. "Святое Раство -- людзям прыгаство" -- такая прымаўка зафіксавана на Усходняй Магілёўшчыне.

Існуе нямала калядных песень. Іх умоўна можна падзяліць на наступныя групы:

1) язычніцкага паходжання, якія не зведалі моцнага хрысціянскага ўплыву ("Прыехала Каляда на белым кані. Яе конічак -- ясны месячык...", "Го-го-го, каза", "Сядзі, сядзі, Яшчур..." і іншыя песні звычайна з прыпевам тыпу "Каляда", "Лада", "Шчодры вечар, добры веар", "Шчодры вечар добрым людзям");

2) раждзественскія песні, у якіх праяўляецца хрысціянскі пачатак, могуць несці значны адбітак фальклярызацыі, гэта т.зв., духоўныя песні;

3) калядкі, што падвергліся пэўнай хрысціянізацыі, напрыклад, уключэнне ці замена ў іх прыпева на "Святы вечар", "Святое Васілле" і іншыя.

Міфолагі мінулага, пачынаючы ад П.Шафарыка, лічылі Каляду язычніцкім боствам. Сучасныя даследчыкі (Ліс, 1992. С. 26 – 27 і інш) бачаць у ёй аграрна-магічны сэнс з "пэўнымі касмаганічнымі ўяўленнямі", "персаніфікаваны вобраз".

Цікавыя матэрыялы пра язычніцкі змест Калядаў сабраны мастацтвазнаўцам М.Кацарам у яго працы «Беларускі арнамент»; «Калядкі спраўляюць для таго, каб было ў дастатку ўсяго. Свята Каляд – каб быў у сям'і ляд. Апырскваюць хату грамнічнаю вадою, каб не зналіся з бядою. Перш-наперш за стол сесці, добра паесці. Сала засмажыць, гарэлкі на стол паставіць. Бога праславіць, спець вясёлую песню, паскакаць, Бога папрасіць, каб усё гэта было на лета. Дамавога пеўня ў хлеў заганяюць, з хлява ўсялякую нечысць выганяюць» (Калінкавіцкі р.). Пра дамавога, які ўвасабляецца ў вобразе пеўня, распавядаецца і ў іншых сведчаннях: «На Каляды дамавога шанаваць ды ўсякую нечысць ад дому праганяць. На Каляды дамавому трэба гадзіць – будзе лета на лета радзіць (Кобрын); «Каляды не бывюаць без

пеўня, ён галоўны завадатар, яго носяць па вуліцы. Вось я і вышыла яго побач з Калядой» (Шаркоўшчынскі р.; Кацар, 1996. С. 92). Калядны сімвал у народным мастацтве па вызначэнню даследчыка – Каляда ў выглядзе жаночай фігуры, або розных разетак, часта з наяўнасцю пеўня.

Ва ўяўленнях украінцаў, Каляда – багіня неба, маці Сонца, жонка Дажбога. Яна нараджае Новы год, Сонца, Божыча. Таму напярэдадні Каляд запальвалі агонь, які павінен быў паўплываць на нараджэнне Божыча і яго барацьбу з багіняй цемры Мараю, спальвалі яе сімвал – каледу (Коваль, 1995. С. 80).

Раство (Natale) – самае значнае свята зімовага цыклу ў італьянцаў, якія звычайна яго адзначаюць у сям'і (25 сн.), бо існуе рымская прымаўка «Раство праводзіць са сваімі, а Пасху там, дзе яна цябе застане». Напярэдадні свята дзеці насілі звязду, спявалі пастараль і атрымлівалі частаванні. Дахрысціянскім абрадам лічыцца запальванне раждзественскага палена, якое павінна гарэць да Новага года (КЗ, 1973. С. 19-21).

Абрадавы агонь вядомы многім народам Еўропы, упамінаецца ў хроніках 1264 г. і невядомы ўсходнім славянам.

У розных правінцыях Францыі існуюць свае дыялектныя назвы свята, якія паходзяць ад лацінскіх слоў (Calendo, Chalande, Caleno, Chalenos, Nadal, Nadan). Вядома характэрная прымаўка «Снежань – месяц святаў і крывяных калбасаў». Свята таксама звязана з культам продкаў. Ім пакідалася на стале рытуальная страва. Традыцыі пастоў (напярэдадні Раства) і багатай раждзественскай вячэры шырока распаўсюджаны ў Еўропе. Калядаванне, у якім адлюстравана язычніцкае ганараванне новалецця, вядома ўсім еўрапейскім народам. Есць свае асаблівасці ў форме, змесце, часе яго правядзення. Царкоўныя ўлады не аднойчы забаранялі гэтыя маладзёжныя і дзіцячыя забавы. У Францыі калядаванне дзяцей з царкоўнага хору канчаткова спынілася ў XVII ст. Знікла амаль поўнасцю пасля другой сусветнай вайны, у некаторых рэгіёнах сляды абраду праяўляюцца ў візітах дзяцей да родзічаў і хросных бацькоў. Тэматыка французскіх калядак мінулых стагоддзяў мае падобнасць з беларускімі.

Своеасаблівае калядаванне (regoles) маюць венгры як католікі, так і пратэстанты. Звычай нясе рэшткі язычніцкага свята, прымеркаванага да сонцавароту. Уладальнікі з зааморфнымі маскамі, сярод якіх вылучаецца «алень» – святая жывёліна мадзьярскіх плямёнаў. У абрадзе з песнямі-віншаваннямі, танцамі, шумнай музыкай даследчыкі бачаць рэшткі старажытнага шаманізма (с. 200). Напярэдадні Раства ў балгар вядома калядаванне, якое працягвалася да раніцы, а на само свята Коледа (Голяма, Божич, Божик) амаль не мае звычаяў, акрамя абрадавага карагода (с. 274).

У XIII ст. каталіцкай царквою быў уведзены звычай наладжвання раждзественскіх яселек, у якіх, з дапамогаю самаробных лялек-персанажаў, адлюстроўвалася нараджэнне Хрыста. У многіх краінах гэта традыцыя шырока развілася, асабліва ў Іспаніі і Партугаліі, дзе яслі называюцца belen (ад слова Бетлеем). Выраб і гандаль «беленамі» там вельмі даходная справа. У Германіі таксама раждзественскім атрыбутам былі яселькі. Яшчэ ў 1930 годзе ў Баварскім лесе праводзіліся шэсці з жывымі персанажамі святога нараджэння (с. 150).

«Раждзественскія яслі» (Wiehnachtskrippe) аўтрыйцы пачыналі ставіць ўжо ў Адвент у каталіцкіх і пратэстанцкіх царквах (с. 181).

У Славеніі і Харватыі на Раство ўсталёўвалі святы вугал, які называлі бетлехем (betlehem). Да апошняй чвэрці XIX ст. іх таксама насілі калоднікі, якія апраналіся ў пастухоў, спявалі і наладжвалі прадстаўленні (pastiri або betlehemari) (с. 247, 251).

«Хаджэнне з Віфлеемам» у венграў традцыцыя толькі каталіцкая, якая ператварылася ў дзіцячую забаву. Заходнія, а затым і усходнія славяне пераанялі звычай наладжання яселек у касцёлах, якія па-за ім ператварыліся ў шопкі (Польшча), бятлемы (Чэхія, Славенія), вяртэпы (Украіна, Расія). У вялікіх бятлемах чэхі выкарыстоўвалі да 250 чалавечых персанажаў і яшчэ больш жывёльных. У Польшчы, Германіі наладжваюцца конкурсы батлеек.

Безумоўна, калядаванне менш падверглася хрысяціянізацыі, многія абрады выяўляюць глыбокія архаічныя рысы. Так, у некаторых правінцыях Пірэнейскага паўвострава вядомы вясновыя звычаі агінальда з выкананнем віншавальных калядак маскараднай працэсіяй як «людзей», так і звяроў (мядзведзь, воўк, ліса).

Асноўнай рытуальнай раждзественскай стравай народаў Еўропы з'яўляецца падсмажаны гусь ці індзейка. Найбольш старажытны абрад у народаў Брытаніі --паляванне крапіўніка на маленькую птушачку і наступнае шэсце па вуліцах (с. 89-90).

Раство (Jonlu) у Фінляндыю прыйшло са Швецыі. Многія традыцыі старога свята Кекры (час «раўнання» сонечнага года) трансфармаваліся на Йолу: гаданне, прадказанне надвор'я, магія ўраджаю і жывёлы, сямейнасць і інш. Нават захавалася прымаўка, якая сведчыць, што сялянам новае свята было чужым: «Кекры ў селяніна – Раство ў паноў» (с. 128).

Скандынаўскія і фінскія лапары-лютэране яшчэ і цяпер на Раство (Ruottabaivve) тайна наведваюць святыя камяні «сейды» і пакідаюць «падарунак», раней ахвяравалі аленя. Акрамя таго захавалася нямала іншых язычніцкіх звычаяў і абрадаў (с. 136-138).

Румынскія вучоныя (с. 288) бачаць старажытнасць Калядаў (Caslegi) – з 25 снежня па 6 студзеня – у іх пастушаскім характары. Значна пазнеў у мясцовых пастухоў Кышледжь пад уплывам праваслаўя змяшаўса са святам Нараджэння Хрыста і з многіх калядак знік матыў пастушаства на карысць земляробству. Рускі даследчык С.А.Токараў тлумачыць паходжанне самой назвы Раства ў Румыніі Крэчыун (Craciunul) словам «krt», што азначае старажытнаславянскае боства, якое ў некаторых народаў дала мадыфікацыю паняццяў «святкі», «раство». У нашай і рускай міфалогіі вядомы Карачун, з якім асацыіруецца «нечаканая смерць», «злы дух»; у закарпацкіх украінцаў – Керечун, у славенцаў – Kracun, у балгар – Крачун, у венграў -- Karacsony. Таму выказваецца думка, што гэта магло быць боства зімы і смерці, якое ганаравалася ў дзень зімовага сонцастаяння (Токараў, 1957. С. 108-109).

8/26. **Каляды** (працяг свята). Абходзілі з калядкамі хаты, у якіх праслаўлялі гаспадароў і іх дзяцей, жадалі дабрабыту. Царкоўнікі ўшаноўвалі сабор Прасвятой Багародзіцы.

У некаторых раёнах Беларусі гэты дзень называлі **Зімнім Пакроўчыкам, Маладзёнамі** або **Бабінамі**. Варылі кашу і пяклі аладкі, жанчыны наведвалі бабку, якая "прымала", ці "бабіла" дзіця, унукі вазілі яе на санках ад хаты да хаты, дзе бабу частавалі, частавала і яна дзяцей, гуляла з імі (Бяссонаў, 1871; Цэбрыкаў, 1862; Дэмбавецкі, 1882; Дабравольскі, 1914).

Пра Каляды існуе шмат прыказак і прымавак: "Прыйшлі Калядкі -- бліны ды аладкі"; "Калядкі -- добрыя святкі: наеўся, напіўся да й на палаткі"; "Насталі Калядкі -- гаспадарам парадкі". Вядомы і такія, што расказвалі аб цяжкай долі селяніна: "Наўрад штоб стала хлеба да Каляд" (Насовіч, 1870); "Ад Каляд не ідзець у лад" (Тышкевіч, 1847); "Прападай ты пане з Калядою, аддай мой мех" (Федароўскі, 1935); "Як прыдуць Каляды -- мужыкі мякіне рады, а як прыйдуць зажынкі -- няма хлеба ні асьмінкі" (Жыткавіцкі раён).

8 студзеня ў Балгарыі – Бабін дзен, што прысвячаецца бабцы-павітусе. У ім наглядаюцца тры моманты: купанне бабкай малых дзяцей, частаванне ў яе доме для жанчын, у якіх прымала роды, і купанне самой бабкі (КЗ, 1973. С. 279-280).

9/27. Працяг **Каляд**. **Сцяпан.** Дзень найму батракоў, слуг у мінулым, таму гаварылі: "На Святога Сцяпана вышэй слуга за пана". Гаспадар будзіў батрака: "Уставай! Табе сягоння Каляда, а мне бяда." Была і прымаўка: "Прыйшлі Калядкі -- гаспадарам парадкі!" (Ашмянскі павет; Крачкоўскі, 1874).

У палякаў знаходзіцца даслоўнае: «Na swiety Szczepan sluga wie – kszy niz pan» (Ярмолаў, 1901. С. 609).

У хрысціянскім календары -- дзень апостала першапакутніка і архідыякона Стэфана. Гэта быў высокаадукаваны і шчырапераканаsuccessfully вернік, які тлумачыў людзям святое Евангелле. Але яго абвінавацілі ў адваротным, у богаадступніцтве. Фанатыкі ўзвялі паклёп і на судзе прадставілі ілжывых сведкаў. Стэфана ў 34 годзе забілі камянямі па ўсходняй традыцыі, а з пятага стагоддзя адзначаецца памяць аб ім. 23 лютага 1792 года беларускаму гораду Радашковічы быў пацверджаны прывілей (ад 15 чэрвеня 1569 г.) на магдэбургскае права і нададзены герб святога Стэфана.

Царкоўны каляндар у гэты дзень адзначае памяць яшчэ двух асоб.

11/29. Працяг **Каляд**. У царкоўным календары дзень прысвячаецца "Пакутнікам 14000 немаўлят, ад Ірада ў Віфлееме забіеных" і шэрагу прападобным. Аб гісторыі забіцця дзяцей да двух гадоў распавядае традыцыйны батлейкавы спектакль "Цар Ірад", які ставіўся на калядныя святы: "Ірад (воіну):

Чуў я, што ў маім царстве
Новы цар нарадзіўся.
Хуценька збірайся,
У Батлеем выпраўляйся.
Усіх немаўлят забівай,
Свайго цара-гаспадара выручай".

Народны каляндар не фіксуе асобнай назвы гэтаму дню, хаця згаданая біблейская падзея ў фальклоры мае месца.

Згадваецца яна, напрыклад, у календары народаў Пірэнейскага паўвострава Santos Inocentos (дзень святых нявінных немаўлят), 28 снежня. Гэты дзень амаль вызваліўся ад царкоўных асацыяцый і выглядае простым дзіцячым святам, на якое

дазваляецца жартаваць і свавоціць (КЗ, 1973. С. 59). У Германіі ў дзень Нявінных дзяцей у паўндёвых абласцях існаваў звычай біцця дарослых розгамі і палкамі. У Югаславіі наадворот -- рытуальнае «біццё» розачкамі адноілася да дзяцей, юнакоў і дзяўчат.

13/31. Пачатак **Шчодрага тыдня,** або **Багатая Каляда**, **Васільеўская Каляда.** У заходнім Палессі -- шчодры вечар **Куготы, Гаготы** або **Агатуха.** Паходжанне такога наймення вынікае з абраду: кідалі ў калодзеж кашу -- відаць, гэта ахвяраванне культу вады, -- тады ж гадалі і крычалі ў калодзеже: "Ку-гу-гу!". З іншых крыніц "Агатуха" паходзіць ад дзеяслова "гагатаць" (весяліцца, смяяцца). Са шчодрым вечарам звязана шмат забарон, павер'яў і варажбы пра будучае замужжа.

**Шчодрая (Шчадроўная, Другая, Мясная, Нішчымная, Скаромная, Багатая, Тоўстая) куцця (Сярэдні Шчадрэц, Шчадруха)** -- абрадавая пераднавагодняя вячэра, якая вызначалася багаццем страў і іх скаромнасцю (тлустае, чаго нельга есці ў пост). Гаспадар запрашаў за стол: "Мароз, хадзі куццю есці. А летам не бувай, хвастом не віляй, бо будом пугаю секці" (Лельчыцкі раён). Таксама называлі "куццёй святога козліка". На ўсе тры куцці (апошняя 18 студзеня) прыкмячалі, якое надвор'е вечарам: калі неба яснае і шмат зорак, то будзе ўраджай на грыбы; калі ідзе снег і мяцеліца, то будуць раі (Магілёўская губерня; Дэмбавецкі, 1882).

Шчадравалі пад вокнамі і ў хатах, дзе славілі гаспадароў. Вадзілі "казу" ("кабылку", "вала", "тура", "мядзведзя", "жорава") і спявалі песні, галоўнай з якіх з'яўлялася "Го-го-го, каза". Шчадроўныя песні адрозніваліся ад калядных у асноўным рэфрэнам. Хадзілі па хатах і са Шчодрай -- прыбранай дзяўчынай. Адзін з нешматлікіх дзён у народным календары, што амаль не зведаў хрысціянскага ўплыву, захаваў дамінуючы язычніцкі змест. Культ вады, ахвяраванне гуся, пераднавагодняя куцця, варажба, Шчодра, ваджэнне "казы" -- вось складаючыя язычніцкага святкавання. Апошні абрад, што мае магічны сэнс, асабліва характэрны і з'яўляецца стрыжнявым у днях зімовага сонцастаяння, які па ўяўленню даследчыкаў мог трансфармавацца ў познім сярэднявеччы з сустрэчы Новага года ў сувязі з увядзеннем юліянскага календара замест візантыйскага.

У маскоўскім Стаглаве ўпамінаюцца як "бясоўскія ігрышчы" тры калядныя куцці (глава 92): "Еще же и пьянствомъ подобне же сему творятъ во дньхъ и въ навечерии Рождества Христова, и въ навечерии Василия Великаго, и въ навечерии Богоявления") (Сахараў, 1895).

У карінах Еўропы таксама папулярнымі вобразамі святаў, звязаных з Раством, з'яўляюцца певень, каза, свіння і інш. Скандынаўскія народы выкарыстоўваюць ва ўпрыгожаннях ёлкі, у якасці падарункаў юлебокар (Julebockar – казёл) і юлегрызар (julegrisar -- свіння), а таксама певень, голуб і інш. (КЗ, 1973. С. 110). Шырока распаўсюджана ў свеце маска каня. Магчыма ў заходніх славян раней хадзілі з жывым канём. Пры ваджэнні «коніка» у Польшчы (Усходняя Мазовія) спяваюць:

Dzie konicek nie chodzi,
Tam zytko rodzi...

А водзячы «казу» там жа --

Dzie koza chodzi,

Tam zyto rodzi... (c. 225-226).

У Польшчы таксама вадзілі «туроня», «бацяна», «мядзведзя», «воўка», «арла», «пеўня», «вала», «барана». Існуюць розныя погляды на язычніцкую аснову гэтых персанажаў.

Калядныя святы ў Румыніі заканчваліся абрадам хаджэння дарослых з «казой», «аленем» і фантастычнай птушкай «brezooia» (с. 289).

Супастаўленне ўкраінскіх і рускіх калядак, як сцвярджаюць даследчыкі У.Чычараў, А.Патабня, У.Пропп, уплыў царквы на іх, хрысціянізацыя, у велікаросаў была слабейшай, у маларосаў – больш моцнай (Пропп, 1963. С. 48). Але па прызнанню таго ж Проппа, у рускіх вобраз казы, які несумненна больш арахаічны, захаваўся слаба, а «быў больш распаўсюджаны ў беларусаў» (с. 49). Х.Яшчуржынскі выказваў думку, што абрад уяўдляе « сімвалічнае ганараванне жывёльнага бога Велеса». Е.Карскі выказваў думку, што абрад ідзе ад «сатурскіх вобразаў язычніцкіх румалляў», запазычаны са Старажытнага Рыма пры дапамозе міміаў-скамарохаў.

Сучасную думку найбольш характэрна адлюстроўвае погляд У.Тапарова ў тым, што «Міфалагічныя ўяўленні аб казле падкрэсліваюць перш за ўсё яго выключную сексуальнасць (у прыніжаным выглядзе – пахатлівасць) і пладавітасць. Адсюль яго сувязь з боствамі і іншымі міфалагічнымі персанажамі, якія ўвасабляюць гэтыя якасці, -- літоўскім Перкунасам, славянскім Перуном, скандынаўскім Торам – аж да грамоўніка ў так зв. Асноўным індаеўрапейскім міфе, а таксама боствамі так ці інакш звязанымі з пладародземм, у прыватнасці з буйнай расліннасцю. Пушанам у індэйцаў...» (Міфы, 1991. С. 663).

14/1. **Новы год** па старому стылю, **Васілле, Васіль (Васілей, Святы Козлік).** З гэтым днём звязваюцца святочныя забароны, павер'і і варажба, а таксама розныя прыкметы. Напрыклад, пчаляры прыкмячалі: калі на першую Каляду "пульга" (мяцеліца), то пчолы будуць раіцца пад Міколу, калі "пульга" пад Васільеўскую Каляду, -- то каля Пятра, а калі пад Хрышчэнскую Каляду, -- то перад Іллёй (Смаленшчына; Дабравольскі, 1894). Свята прадказвала ўраджай на лета: туманы напярэдадні Васілля -- на ўраджай; зорная Васілёва ноч -- багатыя палеткі на лета; калі іней на Васілля, то будзе саломы болей, чым хлеба. (Ляснічы, 1990).

У валачобных песнях зазначаецца: "Святая Васілля дзяжу мясіла, пірагі пякла і рагатыя і багатыя" (Барысаўскі і Дзесенскі паветы; Крачкоўскі, 1874). Раніцай Новага года дзеці сыпалі ў хаце жытам са словамі: "Сею, пасяваю, з Новым годам паздраўляю!" На Быхаўшчыне некалі спявалі:

Ходзя Ілля на Васілля,
Нося пугу
Жыцяную,
Дзе замахне --
Жыта расце,
Дзе не махая,
Там не бывая...

Вечарам дзяўчаты выстройваліся "цыганамі" (Раманаў, 1912).

Славячы вялікае свята, на Краснапольшчыне гаворац: "Святое Васілля -- людзям красілля (Бялькевіч, 1970).

Дарослыя дзяўчаты на Васілле варожаць: выходзяць на вуліцу, падслухоўваюць ля вокнаў чужыя размовы і па іх стараюцца ўгадаць свой лёс; заплюшчваюць вочы, бяруць некалькі пален (бярэмак) дроў і калі лік іх акажацца цотным, то замужжа будзе шчаслівым; кідаюць чаравік за вароты -- у які бок ён упадзе наском, адтуль патрэбна чакаць жаніха; кладуць у некалькіх кучках зерне і даюць кляваць пеўню -- з чыёй кучкі ён пачне дзяўбці, тая дзяўчына хутка пойдзе замуж (Дамбавецкі, 1882). Па звестках беларускіх фальклерыстаў (Ліс, 1998. С.22 і інш.) зафіксавана да 20-ці розных абрадаў для угадвання будучыні і найбольш характэрны з іх «апаланне» паясоў або пацерак. (Чый пояс выпадаў з начовак, якія трэсліся Апалайніцай, з той магло здарыцца «саромнае няшчасце»). Несумненна, варожбы – гэта атрыбут язычніцтва і супрацьлегласць царкве.

У царкоўным календары -- Абразанне Гасподняе, Свяціцель Васіль Вялікі. Назва свята паходзіць ад гэтага імя. Свяціцель Васіль Вялікі (330-379) з Кесарыі Кападакійскай быў міласэрдным епіскапам да нямоглых і злосным карнікам да праціўнікаў веры. А згодна грэчаскай легенды, ён быў земляробам на Крыце і затым стаў у хрысціян своеасаблівым апекуном земляробства («КЗ, 1973. С. 316). У некаторых калядках і шчадроўках маецца рэфрэн з упамінаннем Васіля.

Абрад «засявання» вядомы ўсходнім славянам («засевуха», «засевкі», «Засеванне»). Як заўважыў даследчык зімовых абрадаў А.Гурскі, што больш рэдкай разнавіднасцю абраду з'яўляецца жывёлагадоўчы варыянт у малдаван і на Заходняй Украіне пад назвай «пасяванне», калі «пасявалі» жывёлу і хатнюю птушку, а ў калядках жадалі не толькі вялікага ўраджаю, але і вялікага прыплоду жывёлы (Гурскі; Земляробчы. С. 29).

15/2. **Шчодры.** Першы раз запрагалі ў сані бычка "па другой пашы". Весела каталіся і гаварылі: "Кідай быковае да бяры валовае" (Лельчыцкі раён).

17/4. **Марк.** У Віцебскай губерні існавала павер'е: калі ў дзень Марка пакласці ў зямлю на кароткі час насенне марквы, то летам яно хутчэй прарасце (Нікіфароўскі, 1897).

З 70-ці апосталаў, што адзначае царква ў гэты дзень, каляндар Віцебшчыны вылучаў толькі адно імя.

18/5. **Пісаная (Вадзяная) Каляда (Піскуха, Пабед-Каляда)** -- завяршальны дзень Каляд, Шчодрага тыдня. На сценах будынкаў "пісалі хрэст", што азначала канец Каляд, "Каляда ад'яджае". Абедалі і ішлі на работу (Стаўбцоўскі раён).

**Трэцяя (Апошняя, Вадапосная, Хрышчэнская, Галодная, Вадзяная, Посная) куцця (Вадзянка, Вадзянуха, Вадапосце).** Акраплялі вадою будынкі. У Магілёўскай губерні гаспадар "зваў мароза" з лыжкаю куцці:

Мароз, мароз, хадзі куццю есці!
І іржа і бель, хадзіце цяпер!
А ўлетку к нам не бывайце,
Хлеба нашага не ўбівайце...

(Дамбавецкі, 1882).

У Віцебскай губерні "прасілі мароза, каб не марозіў грэчку, ячмень, квасулю" (Раманаў, 1912).

У Гомельскім павеце, калі даставалі звараную куццю з печы, усе "кохалі", як курыца-квактуха. Дзеці залазілі пад стол і там "кохалі" і "кукарэкалі", маці сыпала

ім семкі. Гэта рабілася для таго, каб выводзілася многа куранят, часцей куры нясліся і найболей было іх у гаспадара (Раманаў, 1912). У гэтым дні адчуваецца моцнае перапляценне хрысціянскай і язычніцкай традыцый. Аб наяўнасці дахрысціянскага святкавання сведчылі старадаўнія пісьмовыя матэрыялы. Царкоўны каляндар абвяшчае Надвячорак Богаз'яўлення (Хрысціянская куцця), дзень посны.

19/6. **Вадохрышча (Хрышчэнне, Кшчэнне)**. Існавалі павер'і аб клопаце пра будучы ўраджай. Лічылася, што зіма павярнула на вясну. "Трашчы не трашчы -- ужо прайшлі Вадахрышчы". Запасаліся свянцонай ("гаючай") вадою на ўвесь год. У валачобных песнях гаворыцца: "Святое Кшчэнне ваду ксціла, ваду ксціла, свет ачысціла і ваду наверх пусціла." Высцілалі дарогі елкамі, рабілі крыж з лёду і фарбавалі яго бурачным сокам.

Народныя прыкметы: снег на Вадохрышча -- добра будуць раіцца пчолы і бульбы вырасце многа; зорная ноч напярэдадні -- уродзіць гарох і ягады высыплюць густа і бурна; пахмурна ў гэты дзень -- чакай ураджаю зерневых, а наадварот -- недарод; калі выдасца цёплы дзень, насыпле снегу -- хлебная ніва густою будзе, але на капусце шмат вусеняў паселіцца; на Вадохрышча завіруха -- на Вялікдзень таксама (Ляснічы, 1990).

На апошнім калядным ігрышчы ў Магілёўскай губерні спявалі:

Вы Калядачкі, вы вярніцеся,
На нас, дзевачак, агляніцеся.
Мы Калядачкам нарадзіць будзем.
Да на йгрышчыкі мы хадзіць будзем.
(Дамбавецкі, 1882)

Святое Богаз'яўленне, Хрышчэнне Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста, як дакладна называецца царкоўнае свята, з'яўляецца асновай, згодна якой пазней утварыліся народныя прыкметы і павер'і. Як сведчыць Біблія, у гэты дзець прарок Іаан хрысціў у вадзе Іардана Сына Бога.

Да «некрштэнім» днёў у Македоніі прымяркоўвалі звычаі «русалляў». Моладзь гуртамі хадзіла з хату ў хату з драўлянымі ятаганамі і прытанцоўвала пад зурну і барабан. У гэты дзень пазбягалі выконваць асобныя работы, каб абараніцца ад нячыстай сілы.

20/7. **Прывадохрышча (Лянівы дзень). Прыцек (Прысеча, Іван Прысеча, Іван Хрысціцель).** Заканчэнне святкавання Каляд. На Палессі. Гавораць: "Іван Прыцік узяў куццю ды й ўцік"; "Вось сёння Хрышчэнне, заўтра Іван Прычэча і Каляда ўчэча" (уцячэ) (Талстая, 1986). "Святы Іван храсты змываў... кашу варыў", -- спяваецца ў валачобных песнях. Лічыцца, што можна ўжо прасці ("Тык-прытык кудзелю прывалык") і выконваць іншыя работы, якія забараняліся на Каляды. У многіх мясцінах Беларусі не прадуць, святкуюць.

З таго дня царква раней дазваляла вянчанне, таму да Масленкі спраўлялася найбольшая колькасць вяселляў. Пара тая называецца **Маладой Вясельніцай.**

Фальклярызацыя хрысціянскага святкавання Сабора Прадцечы і Хрысціцеля Господня Іаанна стала падставай для ўключэння яго ў народны каляндар.

21/8. У некаторых раёнах лічаць гэты дзень, а не мінулы **Прысечай і Провадамі Каляд (Провад-Каляда, Адпусціцель).** На Віцебшчыне канец святаў называецца **Расцвендзень.**

24/11. ***Аксіння.*** "Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце" (Паўлюкоўскі, 1934).

**Фядос.** «На Фядоса цёпла» (Анічэнка, 1992).

Прападобныя Феадосій Вялікі, агульных жыццяў (манастыроў) Начальнік (529 г.); Феадосій  Антыахійскі (каля 412 г.)

25/12. **Таццяна**. Пазначана прыкметай: сонца зіхаціць -- на ранні прылёт птушак, а снег -- на даждлівае лета (Ляснічы, 1990; Анічэнка, 1992).

Акрамя Таццяны і іншых, што разам з ёю пакутавалі ў Рыме (226-235), у царкоўным календары імёны прападобных, пакутнікаў і два абразы.

***Павел***. З каталіцкім прысвяткам звязана павер'е: «Калі ў дзень прыняцця веры святым Паўлам вее вецер – быдзе вайна» (Шукевіч, 1903).

У палякаў, італьянцаў, немцаў, французаў і інш. з Паўлам звязаны прыкметы аб надвор'і.

31/18. **Апанасся (Апанас, Апанасій, Гусінае свята, Гусеўнік).** Дзе-нідзе на Беларусі Апанас лічыўся абаронцам жывёлы ад марозу, а таксама гусіным святам. Гаварылі, нібы апанасаўскія маразы здараліся такія моцныя, што ў "быка-траццяка" (трохгодка) зрывала рогі (Раманаў, 1912). І папярэджвалі: "Хавай нос у апанасаўскі мароз". У Смаленскай губерні існавала прыкмета: калі на Апанаса бывае мяцеліца -- чакаецца працяглая вясна і прыйдзецца нават "пунькі памясці" (Цэбрыкаў, 1862). У Магілёўскай губерні гэты дзень азначаў палову зімы. Калі засталася палавіна корму для жывёлы, то казалі, што яна выжыве да вясны (Дамбавецкі, 1882).

"С еты дня гусей корміць зірнятамі ў абручыку", -- такі звычай быў у беларусаў Смаленшчыны. Яны прасілі аб здароўі жывёлы: "Святы Уласій, Ахванасій, саблюдзі, Божа, красуль нашых" (Дабравольскі, 1894, 1914). Там жа даводзілі: на Апанасся мяцеліца -- многа выведзецца гусянят. Магчыма, тут таксама праяўляюцца сляды Воласа, якога замяніў хрысціянскі Аўлас (Уласій).

Спіс царкоўнага календара на гэты дзень пачынаюць свяціцелі Афанасій (каля 297-373) і Кірыла Александрыйскія. Бацька александрыйскай царквы Афанасій Вялікі быў ярым выкрывальнікам ерасі Арыя і арыян і змагарам за чысціню веры. У невялікім шэрагу імён -- яшчэ два Афанасіі , прападобныя.

Румыны лічылі сярэдзінай зімы ці дзень Пятра Вўчага (16 студзеня) ці Апанаса.